**М. М. Воінава-Страха**

# ЖАНРАВАЯ ПРЫРОДА ЦЫКЛА ТВОРАЎ “БУКЕТ” У. СЦЯПАНА

У кантэксце развіцця айчыннай жанравай сістэмы на сучасным этапе асобнай увагі заслугоўвае ўзаемадзеянне празаічнай мініяцюры і навелы. Асаблівасці іх паэтыкі даюць падставы адзначыць прадуктыўны патэнцыял і перспектыўнасць дадзенага міжжанравага ўтварэння. Разам з тым, паколькі навелістычная мініяцюра не мае паўнавартаснай тэарэтыка-метадалагічнай базы з прычыны спарадычнага звароту да яе з боку айчынных літаратуразнаўцаў, узнікае неабходнасць дэталёвага даследавання адметнасцей існавання гэтай мадыфікаванай формы ў мастацкай прасторы асобных пісьменнікаў.

Уладзімір Сцяпан (нар. у 1958 г.) вядомы як майстар кароткага жанру. З-пад пяра аўтара выйшлі зборнікі “Вежа” (1990), “Сам-насам” (1990), “Адна капейка” (2012), кнігі “Настаўнік. Сяргей Пятровіч Каткоў” (2013), “Папяровая шапка” (2018), “Хвалі” (2019). Адметнасцю яго індывідуальна-творчага стылю з’яўляецца “выяўленчасць” пісьма, “калі маляванне (як працэс і мэта адначасова) становіцца сюжэтным грунтам (“Мінскі альбом”) альбо аб’ектам мастацкай інтэрпрэтацыі” (І. Шаўлякова). У творчасці У. Сцяпана ўзаемадзеянне навелы і мініяцюры праяўляецца найбольш яскрава. Аналіз іх міжжанравага ўзаемадзеяння дазволіць выявіць асаблівасці функцыянавання і развіцця навелістычнай мініяцюры як асобнай жанравай адзінкі.

Навелістычныя мініяцюры з цыкла “Букет” (2018) У. Сцяпана ўтрымліваюць элементы абодвух жанраў, якія праяўляюцца ў рознай ступені інтэнсіўнасці, аднак з’яўляюцца дастаткова акрэсленымі для вызначэння дадзенай міжжанравай формы.

Так, у цэнтры твора “Немка” незвычайны выпадак з жыцця адной сям’і, паўсядзённы ўклад якой быў парушаны наведваннем асаблівага госця – сяброўкі па перапісцы з ГДР. Адмысловаму майстру дэталі У. Сцяпану дастаткова некалькіх штрыхоў, каб чытач імгненна ўлавіў, што візіт замежнай грамадзянкі для савецкай сям’і, чыя прыватная прастора была абмежавана адным пакоем трохпакаёвай камуналкі, стаў па-сапраўднаму знакавай падзеяй: *Дзве сям’і з той камуналкі некуды перасялілі. Прыйшлі будаўнікі і пачалі фарбаваць падлогу і падваконні, паклеілі яркія шпалеры, розныя ва ўсіх пакоях. Адрамантавалі прыбіральню і душавы пакой, пабялілі столь і пафарбавалі пад’езд. Завезлі новыя шафы, вялікую лядоўню, два тэлевізары, кніжкі розныя. Посуду рознага навезлі, пераапранулі ўсю сям’ю ў новае…* (У. Сцяпан). Нельга не адчуць аўтарскую іронію ў спалучэнні з тонкім гумарам у апісанні таго, як пэўны пераварот адбыўся не толькі на побытавым, але свядомасным узроўні, калі суседка апавядальніка раптам адмовіла яму ў сяброўстве.

Кантраснасць і нечаканы паварот, уласцівыя жанру навелы, адмыслова спалучаюцца з мініяцюрнай лаканічнасцю: *Немка выглядала звычайна. Шэрае паліто, швэдар, вязаная шапка, акуляры… Немку штодня вазілі ў*

*Гомель: музеі, тэатр, кіно, каток, лыжы (канькі і лыжы прывезлі новыя). Томка хадзіла па гэпэ важная, не падысці. Немка з'ехала. Мэблю з камуналкі вывезлі, канькі і лыжы забралі, суседзі вярнуліся ў два чысценькія пакоі* (У. Сцяпан).

Пазбаўлены магчымасці пашырэння наратыўнай прасторы з прычыны жанравай спецыфікі, пісьменнік філігранна расстаўляе акцэнты на пэўных фрагментах, дэталях, якія дазваляюць чытачу ўлавіць самае сутнаснае, не адцягваючы ўвагу на другасныя элементы карціны. Аднаго мастакоўскага штрыха часам дастаткова, каб ва ўяўленні сфарміраваўся паўнавартасны сюжэтны малюнак з усёй супярэчнасцю, шматграннасцю і трагічнасцю быцця: *Дзядзька Юзік-сталяр вучыў свайго сына Вітальку лічыць... Пальцы няспешна свае загінаў. Спачатку на левай руцэ – пяць. Потым на правай – тры... Пяць на левай, на правай – тры. Мой аднакласнік Віталька толькі восем і скончыў, а потым – турма. Столькі ж пальцаў было ў Куцапалага Юзіка* ("Вуліцы і людзі") (У. Сцяпан).

Лаканічнасць, уласцівая навелістычнай мініяцюры, істотна ўскладняе задачу пісьменніка пры адборы сродкаў псіхалагізму. З мэтай перадачы адпаведанага псіхаэмацыянальнага фону У. Сцяпан, як прафесійны мастак, факусуе ўвагу чытача на такіх ключавых складніках тэксту, як загаловак і заключэнне. У творы, прысвечаным першаму знаёмству апавядальніка з сусветна вядомым стварэннем Леанарда да Вінчы, аўтар, як вынікае з кантэксту, свядома прадстаўляе скарочаны варыянт назвы карціны "Мона". Канклюзіўны ж сегмент тэксту ўтрымлівае класічнае навелістычнае pointe і такі даволі прыдатны для лаканічнага фармату навелістычнай мініяцюры сродак, як апасіяпеза: *Мне хапіла часу, пакуль чарга набліжала і падштурхоўвала да невялікага палатна ў цьмяна-бліскучай раме. У мяне добры зрок, і я разгледзеў самы знакаміты партрэт. Гэта было неверагоднае расчараванне, амаль да слёз, але я тады не прызнаўся нікому ў сваім расчараванні...* (У. Сцяпан).

Часта ў фокусе ўвагі ў навелістычных мініяцюрах У. Сцяпана – фрагмент, выхаплены з паўсядзённага жыцця, які, з аднаго боку, можа здацца знаёмым чытачу, напрыклад, карціна з маці, што сварыцца на дзіця за дробязь, якую правіннасцю назваць цяжка ("Ніхто"), нецвярозы грамадзянін, які спрабуе недарэчным чынам прыцягнуць да сябе ўвагу на прыпынку ("Ліхтарык") і інш. Аднак дзякуючы адмыслова выбранаму пісьменнікам мастацкаму ракурсу жыццёвае імгненне са, здавалася б, шараговых будней набывае глыбока экзістэнцыяльны падтэкст. За гэтымі адметным чынам пададзенымі эпізодамі прачытваецца і трагізм лёсаў, і супярэчлівасць людскай псіхалогіі, і адметнасці светапогляду, і стракатасць аксіялагічнай праблематыкі, актуальнай для сучаснага грамадства.

З улікам немагчымасці раскрыць сюжэт праз класічныя структурна-кампазіцыйныя элементы аўтар выбірае тэзісны спосаб занатавання дзеяння, засяроджваючыся на фіксацыі ядра цэнтральнай падзеі. Адсутнасць апісальнасці, кампазіцыйная строгасць дазваляюць захаваць такія ключавыя склад-

нікі навелістычныга жанру, як кантрастнасць, парадаксальнасць, нечаканы паварот, якія раскрываюцца праз паралелізм дзеяння (“Ніхто”, “Анёл”), сімвалічнасць назвы твораў і выражэнне псіхаэмацыянальнага стану (“Ліхтарык”, “Натуршчыца”, “Анёл”, “Паліто” і інш.).

Такім чынам, непераўзыйдзены майстар дэталі, У. Сцяпан здольны вылучыць у навакольнай рэчаіснасці, здавалася б, звычайныя прадметы, якія ў кантэксце твора набываюць асаблівае сімвалічнае значэнне, выступаюць і сродкам псіхалагізму, і спосабам выражэння навелістычнай парадаксальнасці, дазваляючы пры гэтым захаваць лаканічны фармат мініяцюры (“Паліто”, “Ліхтарык”, “Грошы”, “Шкло”, “Галіфэ”, “Бэз”, “Першы лёд”).

Выразная наяўнасць прыкмет, уласцівых жанрам навелы і мініяцюры, дазваляе вызначыць жанравую прыроду твораў з цыкла “Букет” У. Сцяпана як навелістычныя мініяцюры. Цыклічныя, паяднаныя агульным праблемнатэматычным полем, дадзеныя творы адрозніваюцца лаканічнасцю і мінімалістычным аб’ёмам. Ім уласцівы навелістычная парадаксальнасць, кантрастнасць, сфакусаванасць на яркім, незвычайным моманце, дынамічнасць і нечаканы паварот сюжэтнай лініі. Спецыфікай навелістычных мініяцюр дадзенага цыкла У. Сцяпана з’яўляецца наяўнасць экзістэнцыяльных матываў, сімвалізм рэчыўнага свету, адметная выразнасць, маляўнічасць і вобразнасць мастацкай дэталі, якая выконвае ролю сэнсавай дамінанты ў мінімалістычнай прасторы тэкстаў.